**Вучэбная дысцыпліна «Кагнітыўная лінгвістыка»**

| | |
|---|---|
| Месца дысцыпліны ў структурнай схеме адукацыйнай праграмы | Адукацыйная праграма магістратуры (паглыбленая вышэйшая адукацыя) Спецыяльнасць: 7-06-0232-01 Мовазнаўства Цыкл спецыяльных дысцыплін: кампанент установы вышэйшай адукацыі * |
| **Кароткі змест** | Спецыфіка кагнітыўнай лінгвістыкі як навукі. Кагнітыўная лінгвістыка ў сістэме гуманітарных навук. Станаўленне кагнітыўнай лінгвістыкі: крыніцы, этапы фарміравання і задачы. Кагнітыўная семантыка. Канцэптуалізацыя свету ў значэннях моўных адзінак. Фрэймавая семантыка як метад кагнітыўнага аналізу моўных адзінак. Прапазіцыянальная форма ўяўлення ведаў пра мову. Катэгарызацыя свету і яе роля ў пазнавальнай дзейнасці чалавека. Катэгарызацыя моўных адзінак. Кагнітыўная тэорыя метафары. Кагнітыўнае мадэліраванне працэсаў семантычнай дэрывацыі. Кагнітыўныя даследаванні дыскурсу. Канцэпт як базавае паняцце кагнітыўнай лінгвістыкі. Структура канцэпту і методыка яго апісання. Канцэпт як аснова моўнай карціны свету. Стэрэатыпы як элементы моўнай карціны свету. Канцэптасфера беларускай культуры |
| **Фарміруемые кампетэнцыі, вынікі навучання** | Базавыя прафесійныя кампетэнцыі: ***ведаць:*** асноўныя канцэпцыі і фундаментальныя навуковыя працы заснавальнікаў дадзенай галіны ведаў, яе гісторыю, сучасны стан і перспектывы развіцця; асноўныя тэрміны і паняцці кагнітыўнай лінгвістыкі; напрамкі ў кагнітыўнай лінгвістыцы на сучасным этапе (культуралагічны, лінгвакультуралагічны, лагічны, семантыка-кагнітыўны, філасофска-семіятычны); тры асноўныя падыходы да разумення канцэпту, заснаваныя на агульным палажэнні: канцэпт – тое, што называе змест паняцця; інтэгральныя і інварыянтныя прыметы канцэпту; традыцыйныя адзінкі кагнітывістыкі (фрэйм, сцэнарый, скрыпт і інш.); асноўныя элементы, якія фарміруюць моўную карціну свету; метады апісання канцэпту; ***умець*:** самастойна працаваць з навуковай літаратурай, прысвечанай пытанням кагнітыўнай лінгвістыкі; прымяняць тэарэтычныя веды пры апісанні і аналізе асобных праблем узаемасувязі мовы і мыслення; арыентавацца ў структуры канцэпту і метадах яго апісання;выбіраць неабходныя метады даследавання і распрацоўваць новыя, зыходзячы з канкрэтных задач; ***валодаць*:** навыкамі разумення сутнасці моўнай камунікацыі; базавым тэрміналагічным інструментарыем кагнітыўнай лінгвістыкі; навыкамі кагнітыўна-лінгвістычнага аналізу ў рамках асноўных канцэпцый дадзенага напрамку; асноўнымі метадамі і прыёмамі даследчай і практычнай работы ў галіне кагнітыўнай лінгвістыкі. |
| **Прэрэквізіты** | Семасіялогія. Лінгвакультуралогія. |
| **Працаёмкасць** | 3 заліковыя адзінкі, 96 акадэмічных гадзін, з іх 50 аўдыторных: 34 г лекцыйных і 16 г практычных заняткаў. |
| **Семестр(ы), патрабаванні і формы бягучай і прамежкавай атэстацыі** | 1-ы семестр, тэсціраванне, экзамен. |